ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
01.08.2025 № 137

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння гэтага вучэбнага прадмета на базавым узроўні ў X–XI класах устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Змястоўны і працэсуальны (практычныя заняткі, вучэбна-палявыя зборы, практычныя заняткі па медыцынскай падрыхтоўцы) кампаненты вучэбнага матэрыялу структураваны па тэмах і размеркаваны па двух модулях, кожны з якіх вывучаецца рознымі групамі вучняў класа:

модуль «Дапрызыўная падрыхтоўка»;

модуль «Медыцынская падрыхтоўка ».

Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 256 гадзін:

у X класе 188 гадзін у год (у кожным модулі па 94 гадзіны: 34 гадзін – на вучэбныя заняткі (1 гадзіна на тыдзень), па 60 гадзін – на вучэбна-палявы збор, практычныя заняткі па медыцынскай падрыхтоўцы);

у XI класе 68 гадзін у год (у кожным модулі па 34 гадзіны (1 гадзіна на тыдзень)).

3. Мэтай модуля «Дапрызыўная падрыхтоўка» з'яўляецца патрыятычнае выхаванне вучняў, фарміраванне ў іх ведаў і ўменняў, неабходных для абароны суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, а таксама маральна-псіхалагічнай гатоўнасці да ваеннай службы.

4. Задачамі з'яўляюцца:

адукацыйная – атрыманне асноўных агульных і спецыяльных ведаў, якія ўключаюць у сябе асновы ваеннай справы, веданне канстытуцыйнага абавязку грамадзян па абароне Рэспублікі Беларусь, азнаямленне з гісторыяй і сучасным станам Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, фарміраванне ўяўлення пра гераізм і мужнасць беларускага народа ў абароне Айчыны, веданне асноў аказання першай дапамогі;

развіццёвая – развіццё валявых якасцей, дысцыплінаванасці, адказнасці, стойкасці, пазнавальных інтарэсаў вучняў;

выхаваўчая – выхаванне ў вучняў патрыятызму, маральнасці, духоўнасці, гуманнасці, калектывізму, узаемадапамогі і ўзаемапавагі, пачуцця асабістай адказнасці за выкананне канстытуцыйнага абавязку па абароне Рэспублікі Беларусь.

5. На вучэбных занятках пры вывучэнні зместу модуля «Дапрызыўная падрыхтоўка» неабходна прымяняць разнастайныя формы і метады навучання і выхавання: расказ, гутарку, самастойную і групавую работу, наглядныя метады навучання, практычнае выкананне нарматываў і

практыкаванняў, якія выклікаюць цікавасць вучняў да вывучаемага матэрыялу, прывіваюць ім любоў да ваеннай справы, забяспечваюць свядомае, трывалае засваенне зместу дадзенай вучэбнай праграмы, спрыяюць выпрацоўцы навыкаў самастойнай працы і ўмення прымяняць на практыцы атрыманыя веды.

Выбар форм і метадаў навучання і выхавання ажыццяўляецца педагагічным работнікам на аснове мэт і задач вывучэння канкрэтнай тэмы з улікам узроўню падрыхтоўкі, узроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў.

Змест модуля «Дапрызыўная падрыхтоўка» рэалізуецца праз дзейнасны, асобасна арыентаваны, культуралагічны і кампетэнтнасны падыходы да арганізацыі адукацыйнага працэсу.

6. Чаканыя вынікі вывучэння зместу модуля «Дапрызыўная падрыхтоўка» па заканчэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

6.1. асобасныя:

разуменне правіл статутных узаемаадносін паміж ваеннаслужачымі;

праяўленне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці;

усведамленне асабістай адказнасці за выкананне канстытуцыйнага абавязку па абароне Рэспублікі Беларусь;

разуменне абарончага характару ваеннай палітыкі Рэспублікі Беларусь;

гатоўнасць да праходжання воінскай службы;

6.2. метапрадметныя:

уменне працаваць з рознай інфармацыяй (праводзіць пошук неабходнай інфармацыі, аналізаваць і ацэньваць яе дакладнасць, вылучаць галоўныя думкі, пераўтвараць інфармацыю з адной формы ў іншую);

уменне ўступаць у дыялог, удзельнічаць у калектыўным абмеркаванні вырашэння праблемных пытанняў, параўноўваць розныя пункты гледжання, аргументаваць свой пункт гледжання, адстойваць сваю пазіцыю;

6.3. прадметныя:

засваенне ведаў аб:

гісторыі і сучасным стане Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь; парадку праходжання ваеннай службы, службы ў рэзерве;

правах, абавязках і адказнасці прызыўніка, парадку прыпіскі да прызыўных участкаў і прызываў на ваенную службу, службу ў рэзерве;

набыццё практычнага вопыту:

транспарціроўкі параненага з вучэбнага поля бою;

стральбы з пнеўматычнай і малакалібернай вінтовак;

кіданні ручной гранаты;

арыентавання на мясцовасці;

карыстання сродкамі абароны ад зброі масавага паражэння;

перамяшчэння на полі бою;

маскіроўкі абарончай пазіцыі;

авалоданне практычнымі навыкамі, якія дазваляюць упэўнена адаптавацца да вайсковай службы.

7. Мэтай вывучэння модуля «Медыцынская падрыхтоўка» з’яўляецца фарміраванне ключавых кампетэнцый па аказанні першай дапамогі пацярпелым у надзвычайных сітуацыях, догляду хворых, прапагандзе здаровага ладу жыцця сярод падрастаючага пакалення, развіццё ўстойлівых пазнавальных інтарэсаў у вучняў, здольнасцей самастойна вывучаць і ацэньваць задачу, прымаць самастойнае рашэнне і дзейнічаць у незнаёмай сітуацыі; выхаванне маральна-валявых якасцей, гуманнасці, маральнасці і духоўнасці ў адносінах да людзей, пачуцця асабістай адказнасці за жыццё бліжняга.

8. Задачы вывучэння модуля «Медыцынская падрыхтоўка»:

фарміраванне ведаў і ўменняў па аказанні першай дапамогі пры адкрытых і закрытых пашкоджаннях, крывацёках, апёках, пашкоджаннях электратокам, утапленні, паражэнні маланкай, цеплавым і сонечным ударах;

навучанне прыёмам імабілізацыі і транспарціроўкі пацярпелага пры розных траўмах і іншых няшчасных выпадках;

авалоданне сістэмай уменняў і навыкаў па аказанні першай дапамогі пры неінфекцыйных і інфекцыйных захворваннях і атручэннях;

набыццё вучнямі ведаў аб прымяненні практычных уменняў і навыкаў па медыцынскай падрыхтоўцы пры надзвычайных сітуацыях і для фарміравання здаровага ладу жыцця;

фарміраванне практычных уменняў і навыкаў па доглядзе хворых;

выхаванне пачуцця адказнасці за свае дзеянні, гуманнасці, маральнасці, духоўнасці і міласэрнасці.

9. Формы і метады навучання і выхавання, якія рэкамендуюцца, павінны быць накіраваны на засваенне вучнямі ведавага і дзейнаснага кампанентаў, развіццё асобы вучня і рэалізацыю выхаваўчага патэнцыялу медыцынскай падрыхтоўкі.

Арганізацыя вучэбных заняткаў па модулі «Медыцынская падрыхтоўка» прадугледжвае франтальную, індывідуальную і групавую формы работы. Формы і віды вучэбнай дзейнасці засноўваюцца на спалучэнні розных метадаў навучання (славесных, наглядных, практычных, праблемна-пошукавых і іншых). Выбар форм і метадаў навучання і выхавання ажыццяўляецца педагагічным работнікам

самастойна на аснове мэт і задач вывучэння канкрэтнай тэмы, вызначаных у дадзенай вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў з улікам іх індывідуальных асаблівасцей.

У ходзе вучэбных заняткаў рэкамендуецца ствараць сітуацыі, у якіх вучні змогуць не толькі засвоіць веды, але і прымяніць іх пры вырашэнні разнастайных надзвычайных сітуацый.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на выкарыстанне разнастайных відаў дзейнасці: працу з рознымі крыніцамі інфармацыі (вучэбнымі дапаможнікамі, табліцамі і інструкцыямі, слоўнікамі і энцыклапедыямі, электроннымі сродкамі навучання), удзел у дыскусіі па праблемных сітуацыях, выкананне практычных работ, рашэнне сітуацыйных задач, аналіз экстрэмальных сітуацый, адпрацоўка практычных уменняў і навыкаў па аказанні першай дапамогі з выкарыстаннем манекена, накладкі на руку (для адпрацоўкі навыкаў падскурных і ўнутрымышачных ін’екцый), разнастайных відаў бінтоў, лейкапластыраў, тэрмометра, танометра, аднаразовага шпрыца.

10. Чаканыя вынікі вывучэння зместу модуля «Медыцынская падрыхтоўка» па заканчэнні навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

10.1. асобасныя:

гатоўнасць выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў паўсядзённым жыцці для аказання першай дапамогі і догляду хворых;

гатоўнасць прымаць рашэнні і дзейнічаць як у тыповых, так і ў нестандартных сітуацыях па захаванні жыцця пацярпелага да прыбыцця выратавальных службаў;

праяўленне каштоўнаснага стаўлення да ўласнага здароўя і здароўя іншых людзей;

гатоўнасць устанаўліваць і падтрымліваць кантакт з пацярпелымі або хворымі людзьмі;

адказныя адносіны да вучэння, гатоўнасць і здольнасць да самаразвіцця і самаадукацыі на аснове матывацыі да навучання;

10.2. метапрадметныя:

уменне самастойна вызначаць мэты навучання, ставіць і фармуляваць новыя задачы ў вучэбнай дзейнасці, развіваць матывы і інтарэсы сваёй пазнавальнай дзейнасці;

уменне працаваць з рознай інфармацыяй (праводзіць пошук неабходнай інфармацыі, аналізаваць і ацэньваць яе дакладнасць, выдзяляць галоўную думку, пераўтвараць інфармацыю з адной формы ў іншую);

уменне ўступаць у дыялог, удзельнічаць у калектыўным абмеркаванні вырашэння праблемных пытанняў, параўноўваць розныя пункты

гледжання, аргументаваць свой пункт гледжання, адстойваць сваю пазіцыю;

10.3. прадметныя:

аваloданне сістэмай ведаў па аказанні першай дапамогі пры адкрытых і закрытых пашкоджаннях, крывацёку, апёках, пашкоджаннях электратокам, утапленні, цеплавым і сонечным ударах, паражэнні маланкай;

уменне выкарыстоўваць на практыцы прыёмы аказання першай дапамогі пацярпелым;

авалоданне сістэмай ведаў па доглядзе хворых пры захворваннях органаў дыхання, кровазвароту, стрававання, эндакрыннай, мочавыдзяляльнай сістэм;

уменне ажыццяўляць догляд пры захворваннях органаў дыхання, кровазвароту, стрававання, эндакрыннай, мочавыдзяляльнай сістэм;

уменне ажыццяўляць індывідуальныя прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне і ўмацаванне здароўя.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ МОДУЛЯ «ДАПРЫЗЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА» Ў Х КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### Абарона Айчыны (8 гадзін)

Доблесць і слава воінаў у барацьбе за свабоду Айчыны. Роля Чырвонай і Савецкай армій у справе станаўлення суверэннай Беларусі. Мужнасць і гераізм беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Воіны-беларусы ў Вялікай Айчыннай вайне. Гераічныя подзвігі беларускіх партызан і падпольшчыкаў на акупаванай тэрыторыі.

Вернасць воінскаму абавязку. Гераізм воінаў-інтэрнацыяналістаў. Самаахвярнасць удзельнікаў ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі. Прыклады мужнасці і гераізму воінаў сучаснай беларускай арміі. Подзвігі беларусаў пры абароне Айчыны.

Рэспубліка Беларусь – суверэнная дзяржава. Роля Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у забеспячэнні нацыянальнай бяспекі. Абарона Рэспублікі Беларусь – свяшчэнны абавязак грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Асноўныя палажэнні аб абароне Айчыны, адлюстраваныя ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь. Сучасны стан і асноўныя напрамкі далейшага развіцця беларускай арміі.

Патрыятызм як аснова свядомых адносін грамадзян да абароны дзяржавы. Важнасць умацавання ў грамадстве пачуцця патрыятызму і гатоўнасці да абароны нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь,

выхавання свядомых адносін грамадзян да ўзброенай абароны Айчыны ў кантэксце сучасных ваенна-палітычных абставін.

Правядзенне дзяржаўнай палітыкі па ўмацаванні ў грамадстве пачуцця патрыятызму і гатоўнасці да абароны нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь, выхаванні свядомых адносін грамадзян да абароны Айчыны – прыярытэтная мера забеспячэння ваеннай бяспекі дзяржавы.

Прававыя асновы ваеннай службы (Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 лістапада 1992 г. № 1914–XII «О воинской обязанности и воинской службе»). Прыпіска да прызыўных участкаў і прызыў на воінскую службу, службу ў рэзерве. Правы, абавязкі і адказнасць прызыўніка. Абавязковая і добраахвотная падрыхтоўка грамадзян да воінскай службы. Прызыўныя камісіі. Апавяшчэнне прызыўнікоў пра яўку для прызыву. Абавязковасць яўкі ў вайсковы камісарыят (адасобленае падраздзяленне) па павестцы. Парадак медыцынскага агляду. Дазвол на адтэрміноўку і вызваленне ад прызыву.

Адміністрацыйная адказнасць за няяўку на мерапрыемствы па прызыве, парушэнне абавязкаў па воінскім уліку. Крымінальная адказнасць за ўхіленне ад мерапрыемстваў па прызыве на воінскую службу, ухіленне рэзервіста або ваеннаабавязанага ад воінскага ўліку.

Установы вышэйшай адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях) для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, органаў нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях (установа адукацыі «Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь», ваенныя факультэты грамадзянскіх устаноў вышэйшай адукацыі, Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь, установы вышэйшай адукацыі органаў пагранічнай службы, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях). Тэрміны навучання і парадак паступлення.

## Асновы ваеннай справы (22 гадзіны)

### Тактычная падрыхтоўка

Сучасны агульнавайсковы бой. Азначэнне агульнавайсковага бою. Асновы тактычных дзеянняў у саставе мотастралковага аддзялення. Агнявыя сродкі, якія прымяняюцца мотастралковым аддзяленнем у агульнавайсковым баі. Абавязкі салдата ў баі. Дзеянні ў абарончым баі. Выбар, трасіроўка і маскіроўка адзіночнага акопа для стральбы (лежачы) з аўтамата. Выкарыстанне мясцовых прадметаў для ўкрыцця, маскіроўкі пазіцыі пры заняцці абароны. Расчыстка сектара абстрэлу, падрыхтоўка да

вядзення агню. Падрыхтоўка да стральбы з розных палажэнняў. Назіранне за полем бою.

Перамяшчэнне на полі бою (скрытнае перамяшчэнне да аб’екта праціўніка): перабежкі і перапаўзанне з выкарыстаннем мясцовасці і мясцовых прадметаў.

Дзеянні ў наступальным баі. Падрыхтоўка да атакі: зараджанне зброі, падрыхтоўка гранат, выбар напрамку руху ў атаку і назіранне за сігналамі камандзіра.

Агнявая падрыхтоўка

Стралковая зброя. Прызначэнне пнеўматычнай (малакаліბернай) вінтоўкі, аўтамата Калашнікава (далей – АК-74).

Прызначэнне частак і механізмаў АК-74. Становішча частак і механізмаў да зараджання, іх работа пры зараджанні і выстрале (стральбе). Патрабаванні бяспекі пры абыходжанні са зброяй і боепрыпасамі. Парадак няпоўнай разборкі і зборкі аўтамата. Парадак запаўнення магазіна патронамі і зараджання зброі. Магчымыя затрымкі і няспраўнасці аўтамата пры стральбе і спосабы іх ліквідацыі. Прыналежнасці да аўтамата. Чыстка і змазка аўтамата пасля стральбы.

Асновы і правілы стральбы. З’ява стрэлу. Пачатковая хуткасць кулі. Траекторыя палёту кулі. Уплыў знешніх умоў на палёт кулі. Гатоўнасць да стральбы. Выбар кропкі прыцэльвання. Карэкціроўка стральбы.

Практычныя заняткі:

Няпоўная разборка АК-74.

Зборка АК-74 пасля няпоўнай разборкі.

Запаўненне магазіна вучэбнымі патронамі.

Практычная стральба. Патрабаванні бяспекі пры правядзенні стральбы. Выкананне практыкаванняў № 1, № 2 стральбы з пнеўматычнай вінтоўкі і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра) (Дадатак 1).

Выкананне нарматываў:

№ 5, № 6, №7 (Дадатак 2).

Страявая падрыхтоўка

Страі і іх элементы. Кіраванне строем. Папярэднія і выканаўчыя каманды. Абавязкі ваеннаслужачых перад пастраеннем і ў страі.

Практычныя заняткі:

Страявая стойка. Выкананне каманд «СТАНАВІСЯ», «РАЎНЯЙСЯ», «СМІРНА», «ВОЛЬНА», «ЗАПРАВІЦЦА», «АДСТАВІЦЬ».

Павароты на месцы. Навучанне выкананню паваротаў на месцы, каманд «Напра-ВА», «Нале-ВА», «Паўабарота напра-ВА», «Паўабарота нале-ВА», «Кру-ГОМ».

Рух страявым і паходным крокам. Навучанне руху страявым крокам, выкананню каманд «Страявым крокам – МАРШ», «Шагам – МАРШ».

Выкананне нарматываў:

№ 13, № 14, №15 ((Дадатак 2).

Статуты Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Прызначэнне і агульны змест агульнавоінскіх статутаў. Агульныя правы і абавязкі ваеннаслужачых. Воінскія званні і знакі адрознення. Начальнікі і падначаленыя, старшыя і малодшыя. Загад (загадванне), парадак яго аддачы і выканання. Абавязкі салдата.

Ваенная прысяга. Змест Ваеннай прысягі. Парадак прыняцця Ваеннай прысягі. Баявы Сцяг воінскай часці Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь – сімвал воінскага гонару, доблесці і славы. Апісанне, парадак уручэння і захоўвання Баявога Сцяга воінскай часці. Воінскія традыцыі і рытуалы.

Воінская дысцыпліна. Абавязкі ваеннаслужачага па падтрымцы воінскай дысцыпліны. Заахвочванні, якія прымяняюцца да салдат, і дысцыплінарныя спагнанні, якія накладаюцца на салдат.

Радыяцыйная, хімічная і біялагічная ахова

Кароткая характарыстыка зброі масавага паражэння.

Ядзерная зброя. Паражальныя фактары ядзернага выбуху. Радыеактыўныя рэчывы. Асноўныя паняцці аб радыеактыўнасці. Характарыстыкі радыеактыўных выпраменьванняў. Віды радыеактыўнага апраменьвання і яго прыметы.

Біялагічная зброя і абарона ад яе.

Хімічная зброя. Таксічныя хімічныя рэчывы, іх класіфікацыя. Атрутныя рэчывы, іх уздзеянне на арганізм чалавека. Паражальныя фактары пры разбурэнні хімічна небяспечных аб’ектаў. Моцнадзеючыя ядавітыя рэчывы і таксіны, іх уздзеянне на арганізм чалавека. Спосабы абароны ад таксічных хімічных рэчываў.

Практычныя заняткі:

Сродкі аховы органаў дыхання. Прызначэнне і ўстройства фільтравальных процівагазаў. Карыстанне процівагазам. Прызначэнне, устройства і правілы выкарыстання рэспіратара.

Сродкі аховы скуры. Прызначэнне і агульнае ўстройства агульнавайсковага ахоўнага камплекта. Выкарыстанне агульнавайсковага ахоўнага камплекта ў выглядзе камбінезона, плашча ў рукавы, накідкі.

Выкананне нарматываў:

№ 8, № 9, №10, № 11, № 12 (Дадатак 2).

Ваенная тапаграфія

Арыентаванне на мясцовасці без карты. Вызначэнне старон гарызонту па компасе, нябесных свяцілах, Сонцы з дапамогай гадзінніка, прыметах мясцовых прадметаў. Вызначэнне свайго месцазнаходжання. Асаблівасці арыентавання ў розных умовах (уначы, у лесе, зімой).

Магнітны азімут і яго вызначэнне. Рух па азімутах.

Складанне схемы маршруту або табліцы для руху па азімутах.

Тапаграфічныя карты. Маштаб карты. Умоўныя тапаграфічныя знакі. Вымерванне адлегласцей па карце. Арыентаванне па карце.

Ваенна-медыцынская падрыхтоўка (4 гадзіны)

Аказанне першай дапамогі раненым у зоне ўкрыцця. Агляд пацярпелага: прыметы жыцця (свядомасць, пульс, дыханне, рэакцыя зрэнкі на святло), прыметы вонкавага крывацёку.

Спыненне вянознага крывацёку метадам накладання прыціскальнай павязкі і метадам тампанады раны. Накладанне асептычнай павязкі на розныя ўчасткі цела. Паслядоўнасць накладання аклюзіўнай павязкі. Правілы накладання медыцынскага кроваспыняльнага жгута (далей – жгут): этапы, асаблівасці, кантроль.

Алгарытм аказання першай дапамогі пры раненнях, крывацёках, пераломах, апёках, абмаражэннях.

Алгарытм правядзення непрамога масажу сэрца, штучнай вентыляцыі лёгкіх, аднаўлення праходнасці верхніх дыхальных шляхоў. Праверка праходнасці верхніх дыхальных шляхоў: ротавая поласць, глотка, гартань. Методыка выдалення іншародных цел з поласці рота, глоткі. Прыём Геймліха. Парадак правядзення сардэчна-лёгачнай рэанімацыі.

Вучэбна-палявыя зборы
(10 дзён па 6 гадзін, усяго 60 гадзін)

Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь (8 гадзін)

Сучаснае ўзбраенне і ваенная тэхніка беларускай арміі.

Азнаямленне з узбраеннем воінскай часці.

Азнаямленне з ваеннай тэхнікай воінскай часці.

Ваеннаслужачыя і ўзаемаадносіны паміж імі. Размяшчэнне ваеннаслужачых. Размеркаванне часу і штодзённы парадак.

Асновы ваеннай справы (42 гадзіны)

Тактычная падрыхтоўка

Практычныя заняткі:

Дзеянні ў абарончым баі. Дзеянні салдата пры падрыхтоўцы да абароны па-за сутыкненнем з праціўнікам. Выбар, капанне і маскіроўка адзіночнага акопа для стральбы. Выкарыстанне мясцовых прадметаў для ўкрыцця і маскіроўкі пазіцыі. Назіранне за полем бою.

Дзеянні ў абарончым баі. Пераход да абароны ва ўмовах уздзеяння праціўніка. Выбар і заняцце пазіцыі для стральбы, прыёмы і спосабы дзеянняў пад агнём праціўніка. Дзеянні па камандах і сігналах камандзіра.

Дзеянні ў наступальным баі. Падрыхтоўка да атакі. Атака пярэдняга краю абароны праціўніка. Перамяшчэнне на полі бою. Перабежкі і перапаўзанне з выкарыстаннем абарончых уласцівасцей мясцовасці.

Выкананне нарматываў:

№ 1, № 2, №3, № 4 (Дадатак 2).

Агнявая падрыхтоўка

Практычныя заняткі:

Практычная стральба. Патрабаванні бяспекі пры правядзенні стральбы. Выкананне стральбы, практыкаванні № 1 і № 2 (Дадатак 1).

Страявая падрыхтоўка

Практычныя заняткі:

Рух аддзялення страявым і паходным крокам.

Ваенна–прыкладная фізічная падрыхтоўка

Практычныя заняткі:

Пераадоленне паласы перашкод. Вывучэнне тэхнікі пераадолення перашкод.

Ваенная тапаграфія

Практычныя заняткі:

Арыентаванне на мясцовасці без карты.

Арыентаванне па компасе, нябесных свяцілах, прыметах мясцовых прадметаў.

Арыентаванне па карце.

Складанне схем руху па азімутах. Рух па азімутах.

Выкананне нарматываў:

№ 17, № 18, №19, № 20 (Дадатак 2).

Дзеянні ў экстрэмальных сітуацыях

Паняцце, віды экстрэмальных сітуацый. Дзеянні чалавека ў экстрэмальнай сітуацыі. Экстрэмальныя ўмовы ў воінскай дзейнасці. Спецыфіка экстрэмальных умоў, магчымых у воінскай дзейнасці (баявой і вучэбна-баявой). Маральна-псіхалагічная гатоўнасць да вайсковай службы.

Ваенна-медыцынская падрыхтоўка (10 гадзін)

Агульныя звесткі пра характар раненняў на полі бою. Асаблівасці аказання першай дапамогі пад агнём праціўніка, у зоне ўкрыцця і зоне эвакуацыі. Адпрацоўка алгарытму аказання першай дапамогі пры раненнях, крывацёках, пераломах, апёках, абмаражэннях.

Практычныя заняткі:

Адпрацоўка методыкі абыходжання з перавязачным матэрыялам. Індывідуальнае медыцынскае абсталяванне ваеннаслужачых. Пакет перавязачны індывідуальны. Прызначэнне, парадак і правілы выкарыстання.

Правядзенне штучнай вентыляцыі лёгкіх, непрамога масажу сэрца. Спыненне крывацёку, накладанне мяккіх бінтавых павязак, імабілізацыя пляча, перадплечча, сцягна, галёнкі, пазваночніка пры пераломах.

Паказанні да транспартнай імабілізацыі. Імабілізацыя верхніх і ніжніх канечнасцей табельнымі і падручнымі шынамі. Імабілізацыя верхніх і ніжніх канечнасцей з дапамогай падручных матэрыялаў.

Эвакуацыя раненых з зоны ўкрыцця. Адпрацоўка спосабаў адцягвання раненых на баку (ранены ў прытомнасці, ранены непрытомны) з дапамогай падручных сродкаў.

Эвакуацыя раненых з зоны ўкрыцця на плашч-палатцы, на руках (адным і двума ваеннаслужачымі), з дапамогай лямкі санітарнай насілачнай, на насілках.

Выкананне нарматываў:

№ 21, № 22, №23, № 24, № 25 (Дадатак 2).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ ЗА X КЛАС

Вучні ведаюць:

асноўныя палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь аб абароне Рэспублікі Беларусь, Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь, Закона Рэспублікі Беларусь «О воинской обязанности и воинской службе» і Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. № 100-З «О статусе военнослужащих»;

сучасныя ваенна-палітычныя абставіны ў свеце;

асноўныя этапы станаўлення і развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь;

подзвігі воінаў-беларусаў, якія праявілі мужнасць і гераізм пры абароне Айчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў сучасны перыяд;

прызначэнне, састаў і структуру сучаснай беларускай арміі, асноўныя віды ўзбраення і ваеннай тэхнікі;

прызначэнне агульнавайсковых статутаў, агульныя правы і абавязкі ваеннаслужачых;

вайсковыя званні і знакі адрозненняў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь;

правілы воінскай ветлівасці;

правы, абавязкі і адказнасць прызыўніка; парадак прыпіскі да прызыўных участкаў і прызыву на вайсковую службу, службу ў рэзерве;

парадак паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях) для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, органаў нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях;

тэкст Ваеннай прысягі і парадак яе прыняцця;

меры бяспекі пры абыходжанні са зброяй;

асновы тактыкі дзеянняў у складзе падраздзялення і парадак дзеянняў салдата ў агульнавайсковым баі;

паражальныя фактары і спосабы абароны ад зброі масавага паражэння;

прызначэнне пнеўматычнай вінтоўкі, устройства і асноўныя характарыстыкі АК-74;

асновы, прыёмы і правілы стральбы з АК-74 і пнеўматычнай вінтоўкі;

асноўныя патрабаванні Дысцыплінарнага ўстава Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (заахвочванні, якія прымяняюцца да салдат; дысцыплінарныя спагнанні, якія накладаюцца на салдат);

умеюць выконваць:

каманды «СТАНАВІСЯ», «РАЎНЯЙСЯ», «СМІРНА», «ВОЛЬНА»;

вайсковае прывітанне на месцы і ў руху; падыход да начальніка і адыход ад яго;

павароты на месцы, рух страявым крокам;

страявыя прыёмы (выхад са строю і вяртанне ў строй, павароты ў руху);

нарматывы па няпоўнай разборцы (зборцы) АК-74, запаўненні магазіна вучэбнымі патронамі (пры ўмове наяўнасці макетаў АК-74 і магазінаў з вучэбнымі патронамі);

стральбу з пнеўматычнай вінтоўкі і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра) і ўстаноўленыя дадзенай вучэбнай праграмай практыкаванні стральбы;

умеюць:

карыстацца сродкамі індывідуальнай абароны – процівагазам і рэспіратарам, агульнавайсковым ахоўным камплектам;

карыстацца компасам;

састаўляць схему маршруту па азімуце, рухацца па азімуце, чытаць тапаграфічную карту і тапаграфічныя знакі, арыентавацца на мясцовасці без карты;

дзейнічаць у агульнавайсковым баі, арыентавацца ў баявой абстаноўцы, выбіраць пазіцыю і здзяйсняць яе маскіроўку;

аказваць першую дапамогу пры раненнях, пераломах, спыненні сардэчнай дзейнасці і дыхання, ажыццяўляць эвакуацыю раненага;

выконваць правілы бяспекі пры абыходжанні са зброяй і стральбе.

## ГЛАВА 3
## ЗМЕСТ МОДУЛЯ «МЕДЫЦЫНСКАЯ ПАДРЫХТОЎКА» Ў Х КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень; усяго 34 гадзіны,
у тым ліку 1 гадзіна – рэзервовы час)

### Тэма 1. Мэты і задачы медыцынскай падрыхтоўкі (1 гадзіна)

Мэты і задачы медыцынскай падрыхтоўкі. Першая дапамога як комплекс мерапрыемстваў сама- і ўзаемадапамогі, накіраваных на выратаванне чалавека пры станах, якія пагражаюць яго жыццю. Ацэнка характару паражэння і ступені цяжкасці стану пацярпелага (свядомасць, пульс, дыханне, рэакцыя зрэнкі на святло). Аб’ём аказання першай дапамогі пацярпелым.

### Тэма 2. Першая дапамога пры траўмах і няшчасных выпадках (23 гадзіны)

Агульныя прынцыпы аказання першай дапамогі. Непрытомнасць. Прычыны страты прытомнасці. Алгарытм аказання першай дапамогі пры раптоўнай страце прытомнасці. Прыметы жыцця і смерці. Паняцце рэанімацыі. Паказанні да рэанімацыі. Тэхніка правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх спосабам з рота ў рот, з рота ў нос. Методыка правядзення непрамога масажу сэрца.

Іншароднае цела ў дыхальных шляхах: сімптомы, алгарытм аказання першай дапамогі. Транспарціроўка пацярпелых.

Адкрытыя пашкоджанні. Паняцце пра рану. Папярэджванне магчымых ускладненняў пасля раненняў. Алгарытм аказання першай дапамогі пры раненнях.

Крывацёкі. Віды крывацёкаў: вонкавы і ўнутраны, капілярны, артэрыяльны, вянозны, змешаны. Спосабы часовага спынення крывацёку: пальцавае прыціскванне, накладанне прыціскальнай павязкі, згінанне канечнасцей, накладанне жгута і закруткі з дапаможных сродкаў. Алгарытм аказання першай дапамогі пры насавым крывацёку.

Перавязачны матэрыял. Агульныя правілы накладання мяккай бінтавой павязкі. Тэхніка накладання мяккіх бінтавых павязак на розныя часткі цела. Правілы выкарыстання падручнага матэрыялу для накладання павязак.

Пашкоджанні мяккіх тканак, суставаў і касцей. Віды і характарыстыка пашкоджанняў. Удары мяккіх тканак. Расцяжэнні і разрывы звязак, сухажылляў і мышцаў. Вывіхі. Алгарытм аказання першай дапамогі.

Траўматычны таксікоз (сіндром працяглага сціскання), алгарытм аказання першай дапамогі на месцы здарэння. Правілы выцягвання пацярпелага з завалаў.

Пераломы. Віды і прыметы пераломаў касцей канечнасцей. Траўматычны шок. Асаблівасці пераломаў у дзяцей і дарослых. Траўмы пазваночніка з пашкоджаннем і без пашкоджання спіннога мозга.

Транспартная імабілізацыя (накладанне шын, фіксавальных павязак) пры разнастайных пераломах касцей канечнасцей. Правілы транспарціроўкі пацярпелых з пашкоджаннем галавы і пазваночніка на шчыце і насілках.

Апёкі і адмаражэнні. Апёкі па фактары пашкоджання (тэрмічныя і хімічныя) і глыбіні пашкоджання (I–IV ступені). Вызначэнне плошчы апёку. Прыметы апёкавага шоку. Апёкавая хвароба. Прафілактыка ўзнікнення апёкавага шоку.

Алгарытм аказання першай дапамогі пры тэрмічных і хімічных апёках. Правілы накладання павязак на абпаленую паверхню. Асаблівасці аказання першай дапамогі пры апёках слізістых абалонак вачэй, рота, стрававода.

Адмаражэнні. Фактары, якія спрыяюць адмаражэнню. Класіфікацыя адмаражэння па глыбіні пашкоджання (I–IV ступені). Замярзанне. Аказанне першай дапамогі ў палявых і хатніх умовах.

Утапленне. Віды ўтапленняў (сапраўднае, асфіксічнае, сінкапальнае) і іх прызнакі. Алгарытм аказання першай дапамогі пры розных відах утапленняў. Прафілактыка ўтапленняў.

Электратраўмы і паражэнне маланкай. Прыметы паражэння. Мясцовыя і агульныя з'явы пры паражэнні электрычным токам. Алгарытм аказання першай дапамогі пры электратраўме.

Сонечныя і цеплавыя ўдары. Прычыны сонечнага і цеплавога ўдараў. Асноўныя прыметы. Алгарытм аказання першай дапамогі пры сонечных і цеплавых ударах. Прафілактыка цеплавых і сонечных удараў.

Укусы жывёламі. Асноўныя прыметы і асаблівасці аказання першай дапамогі пры паражэннях ядамі жывёл. Асаблівасці ўскладненняў раны пры ўкусах. Прафілактыка шаленства.

Атручэнне. Атручэнне хімічнымі рэчывамі. Асноўныя прыметы атручэння. Алгарытм аказання першай дапамогі пры вострых атручэннях чадным газам, прэпаратамі бытавой хіміі, алкаголем і яго сурагатамі, моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі. Прафілактыка атручэнняў.

Харчовае атручэнне. Асноўныя прыметы атручэння. Алгарытм аказання першай дапамогі. Прафілактыка харчовых атручэнняў.

Атручэнне ядавітымі раслінамі і грыбамі. Асаблівасці паражэння, асноўныя прыметы. Алгарытм аказання першай дапамогі пры атручэнні ядавітымі грыбамі і ядавітымі раслінамі. Прафілактыка.

Наркатычнае атручэнне. Асноўныя прыкметы наркатычнага атручвання. Алгарытм аказання першай дапамогі. Прафілактыка наркаманіі.

Практычныя работы:

1. Вывучэнне методыкі правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх і непрамога масажу сэрца.

2. Вывучэнне правіл накладання жгута (закруткі), які (якая) спыняе крывацёк, на сцягно і плячо.

3. Ускрыццё пакета перавязачнага індывідуальнага. Накладанне першаснай асептычнай павязкі на розныя часткі цела.

4. Вывучэнне правіл імабілізацыі верхніх і ніжніх канечнасцей з дапамогай шын і падручных сродкаў пры пераломах, ударах, расцяжэннях, вывіхах.

## Тэма 3. Лекавыя прэпараты і расліны (4 гадзіны)

Паняцце пра лекавыя прэпараты. Лекавыя формы. Асноўныя групы лекавых прэпаратаў: антысептычныя і дэзынфекцыйныя, супрацьмікробныя, сардэчна-сасудзістыя, абязбольвальныя, антыалергічныя, гарачкапаніжальныя, супрацькашлевыя і адхарквальныя.

Уплыў знешніх і ўнутраных фактараў на ўздзеянне лекаў на арганізм. Магчымыя рэакцыі арганізма на лекі, ускладненні. Алгарытм аказання першай дапамогі ў выпадках алергічнай рэакцыі на лекавы сродак.

Змесціва аптэчкі першай дапамогі ўніверсальнай і аптэчкі першай дапамогі для абсталявання транспартных сродкаў (аўтамабільнай). Правілы захоўвання лекавых сродкаў у хатніх умовах.

Паняцце пра лекавыя расліны. Выкарыстанне лекавых раслін пры аказанні першай дапамогі. Правілы бяспечнага абыходжання з лекавымі раслінамі.

Тэма 4. Медыка-біялагічныя аспекты палавога выхавання (5 гадзін)

Паняцце пра рэпрадуктыўнае здароўе.

Гігіена і культура палавых адносін. Віды кантрацэпцыі.

Цяжарнасць. Найбольш спрыяльны ўзрост для шлюбу і цяжарнасці. Фізіялагічныя і псіхалагічныя асаблівасці працякання цяжарнасці. Гігіена цяжарнай жанчыны. Уплыў алкаголю, нікаціну і таксічных рэчываў на развіццё плода.

Аборт і яго вынікі для маладога арганізма. Магчымыя ўскладненні.

Захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам (далей – ЗППШ): ганарэя, сіфіліс, трыхаманоз. Паняцце пра вірус імунадэфіцыту чалавека (далей – ВІЧ) і сіндром набытага імунадэфіцыту (далей – СНІД). Крыніцы заражэння, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Прафілактыка.

Практычныя заняткі па медыцынскай падрыхтоўцы
(10 дзён па 6 гадзін; усяго 60 гадзін)

Тэма 1. Першая дапамога пры траўмах і няшчасных выпадках
(52 гадзіны)

Практычныя заняткі:

1. Тэхніка правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх, непрамога масажу сэрца.

2. Правілы транспарціроўкі пацярпелых на насілках і з дапамогай падручных сродкаў. Асаблівасці аказання першай дапамогі пры пашкоджаннях пазваночніка і спіннога мозга, траўме груднoй клеткі і галавы. Алгарытм дзеянняў.

3. Аказанне дапамогі пры страце прытомнасці, пападанні іншароднага цела ў дыхальныя шляхі. Алгарытм дзеянняў.

4. Аказанне першай дапамогі пры раненні. Адпрацоўка методыкі абыходжання з перавязачным матэрыялам.

5. Адпрацоўка спосабаў спынення крывацёку: пальцавае прыціскание сасуда да косці, максімальнае згінанне канечнасцей, накладанне жгута, закруткі, накладанне прыціскальнай павязкі. Алгарытм дзеянняў пры насавым крывацёку.

6. Адпрацоўка правіл накладання першаснай асептычнай павязкі. Тэхніка накладання мяккіх бінтавых павязак: бінтавыя павязкі на галаву і павязкі на вобласць грудной клеткі. Алгарытм дзеянняў.

7. Аказанне першай дапамогі пры закрытых пашкоджаннях: ударах, расцяжэннях, вывіхах, разрывах сухажылляў, звязак і мышцаў; траўматычным таксікозе (сіндроме працяглага сціскання). Накладанне павязак на канечнасці. Алгарытм дзеянняў.

8. Адпрацоўка тэхнікі накладання павязак на розныя часткі цела. Тэхналогія вырабу перавязачнага матэрыялу з падручных сродкаў.

9. Аказанне першай дапамогі пры пераломах. Адпрацоўка правіл імабілізацыі верхніх і ніжніх канечнасцей з дапамогай шын і падручных сродкаў. Алгарытм дзеянняў.

10. Асаблівасці аказання першай дапамогі пацярпелым пры ўзрывах, абвальванні будынкаў, на месцы дарожна-транспартнага здарэння.

110. Асаблівасці аказання першай дапамогі пацярпелым пры стыхійных бедствах: паводках, лясных пажарах. Алгарытм дзеянняў.

12. Аказанне першай дапамогі пры паражэннях электрычным токам, апёках і адмаражэннях. Алгарытм дзеянняў.

13. Аказанне першай дапамогі пры сонечных і цеплавых ударах, утапленні. Адпрацоўка правіл выратавання тапельца. Алгарытм дзеянняў.

14. Аказанне першай дапамогі пры атручэннях чадным газам, прэпаратамі бытавой хіміі, алкаголем і яго сурагатамі, моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі. Алгарытм дзеянняў пры аказанні першай дапамогі пры харчовых атручэннях, атручэннях ядавітымі раслінамі і грыбамі.

Выкананне нарматываў па медыцынскай падрыхтоўцы:

№ 1 – № 4 (Дадатак 2 «Нарматывы па медыцынскай падрыхтоўцы»).

Тэма 2. Лекавыя прэпараты і расліны (8 гадзін)

Змесціва аптэчкі першай дапамогі ўніверсальнай і аптэчкі першай дапамогі для абсталявання транспартных сродкаў (аўтамабільнай).

Выкарыстанне лекавых раслін (маліны звычайнай, чарніц, шыпшыны карычнай, трыпутніку вялікага, рамонку аптэчнага, валяр’яну лекавага, мяты перцавай, ліпы драбналістай, крапівы двухдомнай) пры аказанні першай дапамогі.

Практычныя заняткі:

15. Аказанне першай дапамогі пры магчымых ускладненнях ад прымянення лекавых сродкаў. Алгарытм дзеянняў.

Экскурсія:

1. Лекавыя расліны.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ

ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ ЗА X КЛАС

Вучні ведаюць:

мэты і задачы медыцынскай падрыхтоўкі;

алгарытм аказання першай дапамогі пацярпелым;

прыметы клінічнай смерці: спыненне дыхання і сардэчнай дзейнасці;

віды крывацёкаў: вонкавы і ўнутраны, капілярны, артэрыяльны, вянозны, змешаны;

віды і асаблівасці пашкоджанняў мяккіх тканак, суставаў і касцей: удар, расцяжэнне, разрыў, вывіх;

віды пераломаў (закрытыя і адкрытыя) і іх прыметы;

віды апёкаў па фактары пашкоджання (тэрмічныя і хімічныя) і глыбіні пашкоджання (I–IV ступені);

віды адмаражэнняў па глыбіні пашкоджання (I–IV ступені);

віды ўтапленняў (сапраўднае, асфіксічнае, сінкапальнае) і іх прыметы;

прыметы паражэння чалавека электрычным токам і маланкай;

прычыны сонечнага і цеплавога ўдараў, іх прыметы;

асноўныя прыметы пры паражэнні чалавека ядамі жывёл;

прыметы харчовых атручэнняў, атручэння чадным газам, прэпаратамі бытавой хіміі, алкаголем і яго сурагатамі, моцнадзейнымі атрутнымі рэчывамі, ядавітымі раслінамі і грыбамі, наркатычнымі рэчывамі;

лекавыя формы і асноўныя групы лекавых прэпаратаў;

змесціва аптэчкі першай дапамогі ўніверсальнай і аптэчкі першай дапамогі для абсталявання транспартных сродкаў (аўтамабільнай);

правілы захоўвання лекавых раслін у хатніх умовах і бяспечнага абыходжання з імі;

наступствы ранняга пачатку палавога жыцця і абортаў для рэпрадуктыўнага здароўя;

фізіялагічныя і псіхалагічныя асаблівасці працякання цяжарнасці;

прыметы ЗППШ;

правілы гігіены і меры прафілактыкі захворванняў рэпрадуктыўных органаў;

умеюць:

ацэньваць характар пашкоджання і ступень цяжкасці стану пацярпелага;

аказваць першую дапамогу пацярпелым пры траўмах, пераломах, крывацёках, ударах, расцяжэннях, вывіхах, раптоўнай страце прытомнасці, апёках, адмаражэннях, паражэнні электрычным токам і маланкай, цеплавым і сонечным удары, утапленні, укусах жывёл, розных відах атручэння;

карыстацца рознымі відамі шын, перавязачным матэрыялам (бінтамі, марляй, гіграскапічнай ватай, бавaўнянай або трыкатажнай тканінай), жгутам;

тлумачыць значэнне ведаў, уменняў і навыкаў па аказанні першай дапамогі ў штодзённым жыцці;

тлумачыць асаблівасці ўплыву знешніх і ўнутраных фактараў уздзеяння лекаў на арганізм;

распазнаваць лекавыя расліны;

прыводзіць прыклады выкарыстання аптэчкі першай дапамогі для абсталявання транспартных сродкаў (аўтамабільнай) для аказання першай дапамогі пацярпелым у дарожна-траспартным здарэнні;

прыводзіць прыклады выкарыстання лекавых раслін пры аказанні першай дапамогі;

тлумачыць негатыўнае ўздзеянне нікаціну, алкаголю і таксічных рэчываў на развіццё плода;

выконваць асабістую прафілактыку ЗППШ;

тлумачыць сэнс асабістых паводзін у прафілактыцы ВІЧ і СНІД;

ажыццяўляць індывідуальныя прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне і ўмацаванне здароўя;

працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі (праводзіць пошук неабходнай інфармацыі, аналізаваць і ацэньваць яе дакладнасць, выдзяляць галоўныя думкі, на падставе аналізу інфармацыі складаць план, пераўтвараць інфармацыю з адной формы ў іншую);

выкарыстоўваць дадатковыя крыніцы інфармацыі для самастойнай падрыхтоўкі паведамлення па тэме вучэбных заняткаў;

валодаюць:

навыкамі аказання сама- і ўзаемадапамогі;

тэхнікай правядзення штучнай вентыляцыі лёгкіх рознымі спосабамі;

методыкай правядзення непрамога масажу сэрца;

методыкай даставання іншародных цел з поласці рота, глоткі;

спосабамі часовага спынення крывацёку з дапамогай пальцавага прыціскання, накладання прыціскальнай павязкі, максімальнага згінання канечнасцей, накладання жгута і закруткі з дапаможных сродкаў;

тэхнікай накладання мяккіх бінтавых павязак на розныя часткі цела;

навыкамі даставання пацярпелага з-пад завалаў;

асновамі самакантролю і самаацэнкі, прыняцця рашэння і ажыццяўлення свядомага выбару ў экстрэмальных сітуацыях;

тэхнікай імабілізацыі верхніх і ніжніх канечнасцей з дапамогай шын і падручных сродкаў пры пераломах, ударах, расцяжэннях, вывіхах;

навыкамі аказання першай дапамогі ў выпадках алергічнай рэакцыі на лекавыя сродкі;

навыкамі назірання за станам здароўя ўласнага арганізма і своечасовага звароту па медыцынскую дапамогу.

## ГЛАВА 4
## ЗМЕСТ МОДУЛЯ «ДАПРЫЗЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА» Ў XI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### Абарона Айчыны (10 гадзін)

Гісторыя і сучаснасць беларускай арміі. Фарміраванне Беларускай ваеннай акругі, яе гісторыя і баявыя традыцыі.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка – адна з заснавальніц Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Уклад Савецкай арміі ў забеспячэнне стратэгічнага ядзернага парытэту на планеце.

Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь – правапераемнік слаўных баявых традыцый Чырвонай і Савецкай армій. Армія суверэннай дзяржавы. Састаў і структура (віды Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, роды войск Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, спецыяльныя войскі). Узбраенне і ваенная тэхніка. Сухапутныя войскі: асноўныя тактыка-тэхнічныя характарыстыкі танка Т-72Б (маса, хуткасць, далёкасць стральбы), баявой машыны пяхоты БМП-2 (маса, хуткасць, далёкасць стральбы), бронетранспарцёра БТР-80 (маса, хуткасць, далёкасць стральбы). Ваенная тэхніка ракетных войскаў і артылерыі: «Паланез», «Ураган», «Смерч», «Град», «Точка» (маса, калібр, далёкасць стральбы). Асноўныя віды стралковай зброі: АК-74, ручны кулямёт Калашнікава (РКК), ручны праціватанкавы гранатамёт (РПГ), пісталет Макарава (ПМ) (калібр, ёмістасць магазіна, прыцэльная далёкасць стральбы). Ваенна–паветраныя сілы і войскі супрацьпаветранай абароны. Прызначэнне асноўных тыпаў самалётаў і верталётаў: Су-25, МіГ-29, Як-130, Іл-76, Л-39, Мі-24, Мі-8 (хуткасць, баявы радыус дзеяння, узбраенне), зенітна–ракетных комплексаў: С-300, «Тор-М2», «Бук», «Оса» (максімальная і мінімальная далёкасць стральбы).

Ваенная палітыка Рэспублікі Беларусь. Ваенная арганізацыя Рэспублікі Беларусь. Абарончы характар Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь. Нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь у ваеннай сферы, адлюстраваныя ў Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Сучасныя ваенна–палітычныя абставіны ў свеце. Характар сучасных узброеных канфліктаў. Інфармацыйнае процiборства – неад’емная частка ваенных канфліктаў, гібрыдныя войны. Асаблівасці вядзення лакальных ваенных канфліктаў на прыкладзе апошняга дзесяцігоддзя. Барацьба з праявамі фашызму і ўзброенага экстрэмізму.

Маральны дух і патрыятычная свядомасць грамадзян як аснова нацыянальнай бяспекі дзяржавы ў сучасных умовах.

Закон Рэспублікі Беларусь «О воинской обязанности и воинской службе» і Закон Рэспублікі Беларусь «О статусе военнослужащих». Парадак праходжання тэрміновай вайсковай службы. Сацыяльныя гарантыі для ваеннаслужачых, якія праходзяць вайсковую службу па прызыве.

Міжнароднае гуманітарнае права ў перыяд узброеных канфліктаў. Паняцце, крыніцы і прынцыпы міжнароднага гуманітарнага права.

## Асновы ваеннай справы (22 гадзіны)

### Тактычная падрыхтоўка

Узброеныя сілы замежных дзяржаў. Узбраенне і баявыя магчымасці армій замежных дзяржаў (Польшчы, Літвы, Латвіі).

Дзеянні ў наступальным баі, паражэнне праціўніка з ходу агнём і гранатамі, вядзенне рукапашнага бою. Супрацьпяхотныя і супрацьтанкавыя міны. Баявыя ўласцівасці ПМН, ПМН-2, МОН-50, ТМ-62. Парадак і спосабы пераадолення мінна-ўзрыўных загарод і перашкод.

### Агнявая падрыхтоўка

Практычныя заняткі:

Практычная стральба. Патрабаванні бяспекі пры правядзенні стральбы. Выкананне практыкавання № 4 (Дадатак 1) стральбы з малакалібернай вінтоўкі (пры адсутнасці – з пнеўматычнай вінтоўкі і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра)).

Парадак няпоўнай разборкі і зборкі аўтамата. Правілы захавання і ўтрымання зброі.

Асновы і правілы стральбы. Прыёмы і спосабы вядзення агню з аўтамата па цэлях, якія з’яўляюцца і рухаюцца.

Разведка цэлей шляхам назірання. Вызначэнне зыходных установак для стральбы і цэлеўказанне з прымяненнем розных спосабаў. Вызначэнне ўстаноўкі прыцэла і кропкі прыцэльвання па вышыні і напрамку.

Ручныя асколачныя гранаты. Прызначэнне, баявыя ўласцівасці і агульнае ўстройства гранат РГД-5, Ф-1, РГО, РГН. Палажэнне частак і механізмаў гранат да кідка. Падрыхтоўка ручных гранат да кідка, работа іх частак і механізмаў пасля кідка. Патрабаванні бяспекі пры абыходжанні з ручнымі гранатамі.

### Страявая падрыхтоўка

Практычныя заняткі:

Павароты падчас руху.

Выхад са строю і вяртанне ў строй. Воінскае прывітанне: на месцы і ў руху. Падыход да начальніка і адыход ад яго.

Пастраенне аддзялення ў разгорнуты і паходны строй. Перастраенне аддзялення з разгорнутага строю ў паходны і назад. Размыканне і змыканне аддзялення.

Выкананне нарматыву № 16 (Дадатак 2).

Статуты Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Агульныя абавязкі ваеннаслужачых. Правілы воінскай ветлівасці і паводзін ваеннаслужачых. Воінскі калектыў і яго асаблівасці. Воінская дысцыпліна, яе сутнасць і значэнне. Дысцыплінарная адказнасць ваеннаслужачых.

Сутачны нарад роты. Прызначэнне, састаў, узбраенне сутачнага нарада. Абавязкі днявальнага па роце.

Ваенна-медыцынская падрыхтоўка (2 гадзіны)

Адпрацоўка алгарытму аказання першай дапамогі пры правядзенні штучнай вентыляцыі лёгкіх, аднаўленні праходнасці дыхальных шляхоў, выдаленні іншародных цел з поласці рота, глоткі. Правядзенне непрамога масажу сэрца, спыненне крывацёкаў. Накладанне мяккіх бінтавых павязак. Імабілізацыя пляча, перадплечча, сцягна, галёнкі, пазваночніка пры пераломах.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ ЗА XI КЛАС

Вучні ведаюць:

асноўныя палажэнні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь аб абароне Рэспублікі Беларусь, Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусь, Закона Рэспублікі Беларусь «О воинской обязанности и воинской службе» і Закона Рэспублікі Беларусь «О статусе военнослужащих»;

сучасныя ваенна–палітычныя абставіны ў свеце;

асноўныя этапы станаўлення і развіцця Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь;

подзвігі воінаў-беларусаў, якія праявілі мужнасць і гераізм пры абароне Айчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ў сучасны перыяд;

прызначэнне, састаў і структуру сучаснай беларускай арміі, асноўныя віды ўзбраення і ваеннай тэхнікі;

прызначэнне агульнавайсковых статутаў, агульныя правы і абавязкі ваеннаслужачых;

вайсковыя званні і знакі адрозненняў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь;

правілы воінскай ветлівасці;

правы, абавязкі і адказнасць прызыўніка, парадак прыпіскі да прызыўных участкаў і прызыву на вайсковую службу, службу ў рэзерве;

парадак паступлення ва ўстановы вышэйшай адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы па спецыяльнасцях (напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыях) для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў Рэспублікі Беларусь, органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, органаў нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Следчага камітэта, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях;

тэкст Ваеннай прысягі і парадак яе прыняцця;

меры бяспекі пры абыходжанні са зброяй;

асновы тактыкі дзеянняў у саставе падраздзялення і парадак дзеянняў салдата ў агульнавайсковым баі;

паражальныя фактары і спосабы абароны ад зброі масавага паражэння;

прызначэнне пнеўматычнай вінтоўкі, устройства і асноўныя характарыстыкі АК-74;

асновы, прыёмы і правілы стральбы з АК-74 і пнеўматычнай вінтоўкі;

асноўныя патрабаванні Дысцыплінарнага статута Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (заахвочванні, якія прымяняюцца да салдат; дысцыплінарныя спагнанні, якія накладаюцца на салдат);

умеюць выконваць:

каманды «СТАНАВІСЯ», «РАЎНЯЙСЯ», «СМІРНА», «ВОЛЬНА»; вайсковае прывітанне на месцы і падчас руху; падыход да начальніка і адыход ад яго;

павароты на месцы, рух страявым крокам;

страявыя прыёмы (выхад са строю і вяртанне ў строй, павароты ў руху);

нарматывы па няпоўнай разборцы (зборцы) АК-74, запаўненні магазіна вучэбнымі патронамі (пры ўмове наяўнасці макетаў АК-74 і магазінаў з вучэбнымі патронамі);

стральбу з пнеўматычнай вінтоўкі і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра) і ўстаноўленыя дадзенай вучэбнай праграмай практыкаванні стральбы;

умеюць:

карыстацца сродкамі індывідуальнай абароны – процівагазам і рэспіратарам, агульнавайсковым ахоўным камплектам;

карыстацца компасам;

састаўляць схему маршруту руху па азімуце, рухацца па азімуце, чытаць тапаграфічную карту і тапаграфічныя знакі, арыентавацца на мясцовасці без карты;

дзейнічаць у агульнавайсковым баі, арыентавацца ў баявой абстаноўцы, выбіраць пазіцыю і ажыццяўляць яе маскіроўку;

аказваць першую дапамогу пры раненнях, пераломах, спыненні сардэчнай дзейнасці і спыненні дыхання, ажыццяўляць эвакуацыю раненага;

захоўваць правілы бяспекі пры абыходжанні са зброяй і стральбе.

## ГЛАВА 5
## ЗМЕСТ МОДУЛЯ «МЕДЫЦЫНСКАЯ ПАДРЫХТОЎКА» Ў XI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(1 гадзіна на тыдзень; усяго 34 гадзіны, у тым ліку 1 гадзіна – рэзервовая)

### Тэма 1. Агульны догляд хворых і паражоных (12 гадзін)

Догляд хворых і паражоных. Асаблівасці догляду хворых і паражоных у працэсе іх лячэння. Асноўныя прадметы догляду хворых.

Тэрмометр. Вымерванне тэмпературы цела.

Падлік частаты пульсу. Назіранне за дыханнем хворага і падлік дыхальных рухаў.

Паняцце аб артэрыяльным ціску. Тэхніка вымервання артэрыяльнага ціску.

Асноўныя механізмы рэфлекторнага ўздзеяння на кровазварот – цеплавыя і халадовыя працэдуры. Паказанні і супрацьпаказанні. Тэхніка пастаноўкі кампрэсаў, гарчычнікаў, грэлак. Прымяненне холаду: пузыр з лёдам, прымочкі.

Метады і шляхі ўвядзення лекавых рэчываў. Правілы выканання ін’екцый (падскурнай, унутрымышачнай). Магчымыя ўскладненні пры выкананні ін’екцый.

Асабістая гігіена хворых. Змена нацельнай і пасцельнай бялізны. Догляд скуры хворага. Мыццё і абціранне цяжкахворых. Гігіена поласці рота, вачэй, вушэй, носа. Пролежні. Прафілактыка пролежняў.

Гігіена зроку. Прафілактычныя меры пры рабоце з камп’ютарам.

Паняцце лячэбнага харчавання. Харчаванне хворых. Харчовы рацыён.

Прафілактыка авітамінозаў і гіпавітамінозаў.

Псіхалогія паводзін хворага. Узроставыя асаблівасці, фізічны стан. Тыпы рэакцыі чалавека на хваробу. Навыкі зносін з хворымі.

Арганізацыя аказання медыцынскай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь. Міжнародны рух Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. Мэты і задачы,

гуманітарная дзейнасць, асноватворныя прынцыпы, эмблема. Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа і яго дзейнасць у развіцці і рэалізацыі міжнароднага гуманітарнага права.

1. Вымерванне тэмпературы цела. Падлік пульсу.

2. Вывучэнне тэхнікі вымервання артэрыяльнага ціску.

3. Вывучэнне тэхнікі накладання гарчычнікаў, кампрэсаў, грэлкі, пузыра з лёдам.

4. Вывучэнне будовы аднаразовага шпрыца, яго падрыхтоўка і прымяненне.

5. Набыццё практычных навыкаў па падскурным і ўнутрымышачным увядзенні лекавых сродкаў.

Тэма 2. Першая дапамога пры захворваннях (11 гадзін)

Першая дапамога. Мэты, задачы, значэнне. Паняцце пра сімптом і сіндром хваробы. Знешнія і ўнутраныя фактары, якія ўплываюць на ўзнікненне і развіццё захворванняў. Шляхі перадачы захворванняў.

Хваробы органаў дыхання. Асноўныя сімптомы захворванняў органаў дыхання. Востры бранхіт, пнеўманія, бранхіяльная астма: прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка захворванняў органаў дыхання.

Хваробы органаў кровазвароту. Асноўныя сімптомы захворванняў органаў кровазвароту. Ішэмічная хвароба сэрца (стэнакардыя, інфаркт міякарда), гіпертанічная хвароба, непрытомнасць, інсульт. Прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка сардэчна-сасудзістых парушэнняў.

Хваробы органаў стрававання. Асноўныя сімптомы захворванняў органаў страўнікава-кішэчнага тракту. Вострыгастрыт, язвавая хвароба страўніка і дванаццаціперснай кішкі, вострая пячоначная коліка. Прычыны ўзнікнення, аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка.

Хваробы эндакрыннай сістэмы. Цукровы дыябет. Асноўныя сімптомы і прычыны. Аказанне першай дапамогі пры дыябетычнай коме. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка.

Хваробы органаў мочавыдзяляльнай сістэмы. Асноўныя сімптомы захворванняў мочавыдзяляльнай сістэмы. Вострыпіеланефрыт, ныр ачная коліка, вострыцыстыт. Прычыны ўзнікнення. Аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду. Прафілактыка.

Радыяцыйныя паражэнні. Біялагічнае ўздзеянне іанізаванага выпраменьвання на арганізм чалавека. Вострая прамянёвая хвароба. Асноўныя сімптомы. Аказанне першай дапамогі. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі.

Анкалагічныя захворванні. Анкалогія. Асноўныя сімптомы пухлін. Рак малочнай залозы, лёгкіх, страўніка. Прафілактыка анкалагічных захворванняў і яе значэнне.

Тэма 3. Інфекцыйныя захворванні (10 гадзін)

Паняцце пра інфекцыю. Прычыны ўзнікнення і распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў. Шляхі перадачы інфекцыі.

Эпідэмія, пандэмія, эпідэмічны ачаг, эпідэмічны працэс. Сучасныя метады і сродкі барацьбы з інфекцыйнымі захворваннямі.

Імунітэт, віды імунітэту. Роля вакцын і сываратак у папярэджванні і лячэнні інфекцыйных захворванняў.

Кішэчныя інфекцыі. Брушны тыф, дызентэрыя, вірусны і сываратачны гепатыты: крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка.

Паветрана–кропельныя інфекцыі. Вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі, грып, ангіна: крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка.

Дзіцячыя інфекцыі. Адзёр, ветраная воспа, шкарлятына, краснуха: крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы захворванняў. Асаблівасці догляду. Прафілактыка дзіцячых інфекцыйных захворванняў.

Туберкулёз. Формы туберкулёзу. Крыніцы і шляхі перадачы захворвання, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка.

Паражэнне скуранога покрыва. Педыкулёз, кароста, мікраспарыя: крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Асаблівасці догляду за хворымі людзьмі. Прафілактыка.

Крывяныя інфекцыі. Сыпны тыф, клешчавы энцэфаліт, лейшманіёзы: крыніцы заражэння, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы. Прафілактыка.

Гельмінтозы. Аскарыдоз, энтэрабіёз, трыхацэфалёз: крыніцы інфекцый, шляхі перадачы, сімптомы. Асаблівасці догляду. Прафілактыка.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ ЗА XI КЛАС

Вучні ведаюць на ўзроўні ўяўлення пра сімптомы вострай прамянёвай хваробы і анкалагічныя захворванні;

ведаюць:

мэты і задачы першай дапамогі;

асноўныя сімптомы і прычыны ўзнікнення захворванняў органаў дыхання, кровазвароту, стрававання, эндакрыннай сістэмы, мочавыдзяляльнай сістэмы;

метады і шляхі ўвядзення лекавых рэчываў;

магчымыя ўскладненні пры выкананні ін’екцый;

асноўныя механізмы рэфлекторнага ўздзеяння на кровазварот;

асаблівасці харчовага рацыёну хворых людзей пры разнастайных захворваннях;

асаблівасці рэагавання на хваробу людзей рознага ўзросту;

асноватворныя прынцыпы дзейнасці Міжнароднага руху Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца, Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа;

прычыны ўзнікнення і распаўсюджвання інфекцыйных захворванняў;

прычыны, шляхі перадачы і асноўныя сімптомы кішэчных, паветрана–кропельных, дзіцячых і крывяных інфекцый;

крыніцы, шляхі перадачы і асноўныя сімптомы туберкулёзу;

крыніцы, шляхі перадачы і асноўныя сімптомы захворванняў скуры (педыкулёзу, каросты, мікраспарыі);

крыніцы, шляхі перадачы, асноўныя сімптомы аскарыдозу, энтэрабіёзу, трыхацэфалёзу;

умеюць:

ажыццяўляць догляд пры захворваннях органаў дыхання, кровазвароту, стрававання, эндакрыннай сістэмы, мочавыдзяляльнай сістэмы;

аказваць першую дапамогу пры радыяцыйным паражэнні;

называць і вызначаць прызначэнне асноўных прадметаў догляду за хворымі людзьмі;

тлумачыць неабходнасць прафілактыкі пролежняў, авітамінозаў і гіпавітамінозаў;

тлумачыць асаблівасці асабістай гігіены хворых людзей, гігіены зроку;

тлумачыць ролю вакцын і сываратак у папярэджванні і лячэнні інфекцыйных захворванняў;

тлумачыць неабходнасць прафілактыкі інфекцыйных захворванняў;

тлумачыць важнасць прафілактыкі туберкулёзу, педыкулёзу, каросты, мікраспарыі, аскарыдозу, энтэрабіёзу, трыхацэфалёзу;

ажыццяўляць прафілактычныя мерапрыемствы, накіраваныя на захаванне і ўмацаванне здароўя;

тлумачыць ролю здароўя як важнай асабістай і грамадскай каштоўнасці;

працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі (праводзіць пошук неабходнай інфармацыі, аналізаваць і ацэньваць яе дакладнасць, выдзяляць галоўныя думкі, на падставе аналізу інфармацыі складаць план, пераўтвараць інфармацыю з адной формы ў іншую);

валодаюць:

тэхнікай накладання гарчычнікаў, кампрэсаў, грэлкі, пузыра з лёдам;

навыкамі змены нацельнай і пасцельнай бялізны, напаўнення аднаразовага шпрыца;

тэхнікай падскурнага і ўнутрымышачнага ўвядзення лекавых сродкаў;

тэхнікамі вымервання тэмпературы цела, падліку дыхальных рухаў і падліку частаты пульсу;

навыкамі апрацоўкі поласці рота, вачэй, вушэй, носа хворага;

навыкамі назірання за станам здароўя ўласнага арганізма і своечасовага звароту па медыцынскую дапамогу.

Дадатак 1
да вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

## УМОВЫ ПРАКТЫКАВАННЯЎ СТРАЛЬБЫ З ПНЕЎМАТЫЧНАЙ І МАЛАКАЛІБЕРНАЙ ВІНТОВАК
і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра)

### Практыкаванні стральбы з пнеўматычнай вінтоўкі
і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра)

#### Практыкаванне № 1

Цэль – мішэнь з кругамі № 8, усталяваная на ўзроўні вачэй вучня, які страляе.

Далёкасць цэлі – 10 м.

Колькасць куль – 5 шт.

Час на стральбу – не больш за 3 мін.

Становішча для стральбы – лежачы (стоячы, седзячы) з упору.

Адзнака:

9–10 балаў – трапіць у цэль (чорны круг) пяццю кулямі;

7–8 балаў – трапіць у цэль чатырма кулямі;

5–6 балаў – трапіць у цэль трыма кулямі;

3–4 балы – трапіць у цэль дзвюма кулямі;

1–2 балы – трапіць у цэль адной куляй.

Найвышэйшы бал адзнакі характарызуе кучнасць стральбы (прабоіны змяшчаюцца ў круг дыяметрам 15 мм).

#### Практыкаванне № 2

Цэль – мішэнь з кругамі № 8, усталяваная на ўзроўні вачэй вучня, які страляе.

Далёкасць цэлі – 10 м.

Колькасць куль – 5 шт.

Час на стральбу – не больш за 3 мін.

Становішча для стральбы – лежачы (стоячы, седзячы) з упору.

Адзнака:

| Выбіта ачкоў | 40 | 36 | 32 | 28 | 24 | 20 | 16 | 12 | 8 | 4 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адзнака (балы) | 10 | 9 | 8 | 7 | 6 | 5 | 4 | 3 | 2 | 1 |

Мішэнь для выканання практыкаванняў стральбы з пнеўматычнай вінтоўкі і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра)




Мишень № 8.
Размеры даны в мм

Практыкаванні стральбы з малакалібернай вінтоўкі і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра)

Практыкаванне № 3

Цэль – грудная фігура з кругамі (мішэнь № 4), паменшаная ў 4 разы, усталяваная на вышыні вачэй вучня, які страляе, нерухомая.

Далёкасць цэлі – 25 м.

Колькасць патронаў – 3 шт.

Час на стральбу – не больш за 2 мін.

Становішча для стральбы – лежачы з упору.

Адзнака:

8–10 балаў – трапіць у цэль трыма стрэламі;

5–7 балаў – трапіць у цэль двума стрэламі;

2–4 балы – трапіць у цэль адным стрэлам;

0–1 бал – у цэль не патрапілі.

Найвышэйшы бал адзнакі характарызуе кучнасць стральбы (прабоіны змяшчаюцца ў круг дыяметрам 60 мм).

Практыкаванне № 4

Стральба з месца па нерухомай цэлі днём

Цэль – грудная фігура з кругамі (мішэнь № 4), паменшаная ў 4 разы, усталяваная на вышыні вачэй вучня, які страляе, нерухомая.

Далёкасць цэлі – 25 м.

Колькасць патронаў – 5 шт.

Час на стральбу – не больш за 3 мін.

Становішча для стральбы – лежачы з упору.

Адзнака:

| Выбіта ачкоў | 45 | 41 | 36 | 32 | 27 | 23 | 18 | 14 | 9 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адзнака (балы) | 10 | 9 | 8 | 7 | 6 | 5 | 4 | 3 | 2 | 1 |

Мішэнь для выканання практыкаванняў стральбы з малакалібернай вінтоўкі і (або) з выкарыстаннем мультымедыйнага вучэбнага трэнажора (ціра, абсталявання для ціра)




Мішэнь № 4, паменшаная ў 4 разы.

Памеры дадзены ў мм

Дадатак 2
да вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Дапрызыўная і медыцынская падрыхтоўка» для X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

# НАРМАТЫВЫ ПА ДАПРЫЗЫЎНАЙ І МЕДЫЦЫНСКАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

## НАРМАТЫВЫ ПА ДАПРЫЗЫЎНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку.<br>Адзнака |
|---|---|---|---|
| Тактычная падрыхтоўка | | | |
| 1. | Выбар месца для вядзення агню, трасіроўка акопа | Вучань уводзіцца ў тактычнае становішча, перад ім ставіцца задача на выбар месца для вядзення агню і трасіроўку акопа для вядзення агню. Акоп трасіруецца лежачы. Час (да 2 мін) адлічваецца ад каманды «Да адпрацоўкі нарматыву прыступіць» да даклада аб гатоўнасці | Памылкі:<br>дапушчаны памылкі пры выбары месца для вядзення агню; не вытрыманы памеры і форма акопа; не вялося назіранне за праціўнікам; адсутнічала пастаянная гатоўнасць да адкрыцця агню; дзеянні няўпэўненыя.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 2 мін.<br>Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца за захаванне мер маскіроўкі пры выкананні нарматыву |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| 2. | Перамяшчэнне на полі бою перабежкамі і перапаўзаннем (скрытнае перамяшчэнне да аб'екта праціўніка) | Вучань уводзіцца ў тактычнае становішча, перад ім ставіцца задача на перамяшчэнне. Участак мясцовасці глыбінёй 100 м ён пераадольвае: перабежкай – 30 м, перапаўзаннем па–пластунску – 40 м, перабежкай – 30 м. Час (да 2 мін 30 с) адлічваецца ад каманды «Наперад» да дасягнення паказанай мяжы і падрыхтоўкі да стральбы лежачы | Памылкі:<br>галава і цела пры перапаўзанні паднімаюцца ад зямлі; даўжыня перабежак паміж прыпынкамі большая за ўсталяваную; вучань падчас прыпынку пасля перабежкі не адпоўз убок і не падрыхтаваўся да вядзення агню; для прыпынкаў пры перабежцы не выкарыстоўваліся наяўныя схаваныя месцы (сховішчы); перамяшчэнне вядзецца без уліку асаблівасцей рэльефу мясцовасці; не вядзецца назіранне за мясцовасцю і праціўнікам.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 2 мін 30 с.<br>Найніжэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры нядбайным абыходжанні са зброяй |
| 3. | Выяўленне цэлей, вызначэнне іх месцазнаходжання і даклад аб выніках назірання | У сектары назірання на адлегласці 300–1500 м ад назіральніка размешчана 5 цэлей. Вучань уводзіцца ў тактычнае становішча, перад ім ставіцца задача на назіранне: выявіць цэлі, вызначыць іх месцазнаходжанне адносна арыенціраў і мясцовых прадметаў, вызначыць адлегласці да іх, далажыць вынікі назірання. Час (да | Адзнака:<br>9–10 балаў – выяўлена 5 цэлей, памылкі ў вызначэнні адлегласцей: не больш за 5%, даклад упэўнены і выразны;<br>7–8 балаў – выяўлена 4 цэлі, памылкі ў вызначэнні адлегласцей: не больш за 10%, даклад няўпэўнены;<br>5–6 балаў – выяўлена 3 цэлі, памылкі ў вызначэнні адлегласцей: не больш за 15 %, пры дакладзе дапушчаны нязначныя недакладнасці;<br>3–4 балы – выяўлена 2 цэлі, памылкі ў вызначэнні адлегласцейя: не больш за 20 %, пры дакладзе дапушчаны |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | 8 мін) адлічваецца ад каманды «Да разведкі цэлей прыступіць» да заканчэння даклада аб выніках назірання | недакладнасці; час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 7 мін);<br>1–2 балы – выяўлена 1 цэль; памылкі ў вызначэнні адлегласцей: не больш за 25%; пры дакладзе дапушчаны значныя недакладнасці; час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 8 мін.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца за захаване мер маскіроўкі пры выкананні нарматыву |
| 4. | Перамяшчэнне на полі бою перабежкамі ў складзе аддзялення | Падраздзяленне пераадольвае ўчастак мясцовасці глыбінёй 300 м кароткімі перабежкамі (у аддзяленнях па аднаму) | Памылкі і адзнака аналагічныя нарматыву 2 |
| Агнявая падрыхтоўка | | | |
| 5. | Няпоўная разборка аўтамата | Вучань стаіць каля стала. Зброя ў сабраным выглядзе ляжыць на стале. Час (60 с) адлічваецца ад каманды «Да няпоўнай разборкі аўтамата прыступіць» да даклада аб гатоўнасці | Памылкі: не агледжаны патроннік на прадмет адсутнасці ў ім патрона; парушана паслядоўнасць разборкі; асобныя часткі раскладзены неакуратна; даставанне частак выконваецца з вялікім намаганнем.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 1 мін.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца пры перакрыцці часу нарматыву на 10 с |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| 6. | Зборка аўтамата пасля няпоўнай разборкі | Вучань стаіць каля стала. Часткі аўтамата раскладзены на стале ва ўстаноўленым парадку. Час (60 с) адлічваецца ад каманды «Да зборкі аўтамата прыступіць» да даклада аб гатоўнасці | Памылкі:<br>парушана паслядоўнасць зборкі; злучэнне частак праводзіцца з намаганнем; не праверана работа частак і механізмаў; не зроблены спуск курка пасля зборкі; аўтамат не пастаўлены на засцерагальнік.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 1 мін.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца пры перакрыцці часу нарматыву на 10 с |
| 7. | Зараджанне магазіна вучэбнымі патронамі | Вучань стаіць каля стала (перад падсцілкай), на падсцілцы размешчаны вучэбныя патроны (30 шт., россыпам) і магазін. Час адлічваецца ад каманды «Да зараджання магазіна прыступіць» да даклада аб гатоўнасці | Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы дакладна, упэўнена, хутка (да 1 мін);<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы, прыёмы правільныя, але тэмп запаволены (да 1 мін 10 с);<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы, але дзеянні няўпэўненыя, тэмп запаволены (да 1 мін 20 с);<br>3–4 балы – нарматыў выкананы, але дзеянні няўпэўненыя, патроны ўкладваюцца ў прыёмнік з вялікім намаганнем, тэмп павольны (да 1 мін 30 с);<br>1–2 балы – нарматыў выкананы, але дзеянні няўмелыя, няўпэўненыя; тэмп павольны (да 1 мін 45 с). |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі становішча магазіна правільнае, са стала бярэцца адначасова некалькі патронаў |
| Радыяцыйная, хімічная і біялагічная ахова | | | |
| 8. | Надзяванне процівагаза | У вучня ёсць процівагаз у паходным стане. Па камандзе «Газы» надзяваецца процівагаз. Час адлічваецца ад моманту падачы каманды да аднаўлення дыхання пасля надзявання процівагаза | Памылкі:<br>пры надзяванні вучань не заплюшчыў вочы і не затрымаў дыханне; пасля надзявання процівагаза не зроблены выдых; шлем–маска надзета з перакосам.<br>Кожная памылка зніжае адзнаку на 1 бал.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 8 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 9 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 10 с;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 11 с;<br>1–2 балы – пашкоджаны процівагаз, або нарматыў выкананы больш чым за 11 с |
| 9. | Карыстанне няспраўным процівагазам у заражанай атмасферы | У вучня ёсць процівагаз у баявым стане. Кіраўнік даводзіць да вучня характар пашкоджання процівагаза: пашкоджана фільтравальная каробка; пашкоджана шлем–маска. Час адлічваецца ад моманту падачы каманды «Да ўстаранення няспраўнасці прыступіць» да аднаўлення дыхання | Памылкі:<br>вучань не заплюшчыў вочы і не затрымаў дыханне; пасля ўстаранення няспраўнасці не зрабіў поўны выдых; не цалкам накручана фільтравальная каробка на шлем–маску; дзеянні няўмелыя, няўпэўненыя.<br><br>Адзнака:<br>1. Пры замене фільтравальнай каробкі:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 15 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 16 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 17 с;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 18 с; |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | 1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 18 с.<br>Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал.<br>2. Пры здыманні шлема–маскі:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 8 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 9 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 10 с;<br>3–4 балы — нарматыў выкананы за 11 с;<br>1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 11 с.<br>Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал |
| 10. | Надзяванне рэспіратара | У вучня ёсць рэспіратар у паходным стане. Па камандзе «Рэспіратар надзець» вучань надзявае рэспіратар. Час адлічваецца ад моманту падачы каманды да надзявання рэспіратара і поўнага выдыху | Памылкі:<br>пры надзяванні рэспіратара вучань не затрымаў дыханне; пасля надзявання не зроблены поўны выдых; канцы насавога заціску рэспіратара не прыціснуты да носа; дзеянні няўмелыя, няўпэўненыя.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 8 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 9 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 10 с;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 11 с;<br>1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 11 с, пашкоджаны рэспіратар. |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал |
| 11. | Надзяванне агульнавайсковага ахоўнага камплекта | У вучня ёсць сродкі аховы ў паходным стане. Час адлічваецца ад падачы каманды «Плашч у рукавы, панчохі, пальчаткі надзець. Газы» да поўнага надзявання сродкаў аховы і дакладу «Гатоў» | Памылкі:<br>надзяванне ахоўных панчох праводзілася з зашпіленымі хлясцікамі; панчохі не падвязаны, няправільна зашпілены барты плашча або не цалкам надзеты панчохі; не замацаваны закрэпкамі трымальнікі шпянькоў, або не зашпілены 2 шпянькі; дапушчаны памылкі пры надзяванні процівагаза.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 3 мін 30 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 4 мін;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 4 мін 30 с;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 5 мін;<br>1–2 балы – час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 5 мін, або пашкоджаны сродкі аховы.<br>Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал |
| 12. | Дзеянні па сігнале «Хімічная трывога» | У вучня ёсць сродкі аховы ў паходным стане. Вучань надзявае процівагаз, плашч у выглядзе накідкі і вядзе назіранне за мясцовасцю. Час адлічваецца ад падачы каманды, сігналу «Хімічная трывога» да надзявання сродкаў аховы і дакладу «Гатоў» | Памылкі:<br>не надзеты капюшон на галаву; не захінуты барты плашча; дапушчаны памылкі пры надзяванні процівагаза; не вядзецца назіранне за мясцовасцю.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 50 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 10 с; |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | 3–4 балы – нарматыў выкананы за 1 мін 20 с;<br>1–2 балы — час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 1 мін 20 с, або пашкоджаны сродкі аховы.<br>Найвышэйшы бал адзнакі (у межах узроўню адзнакі) выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал |
| Страявая падрыхтоўка | | | |
| 13. | Страявая стойка | Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы | Памылкі:<br>наскі разгорнуты не па лініі фронту і не на шырыню ступні; абцасы не пастаўлены разам; кісці рук не па сярэдзіне сцёгнаў, трымаюцца далонямі назад; грудзі не прыўзняты; жывот не падабраны; цела не пададзена ўперад; галава апушчана; рукі сагнуты ў локцях.<br>Адзнака:<br>10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа;<br>9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем;<br>8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка;<br>7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі; |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | 6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі;<br>5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі;<br>4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі;<br>3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі;<br>2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак;<br>1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак |
| 14. | Павароты на месцы | Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы | Памылкі:<br>пасля павароту не захоўваецца правільнае становішча рук і ног; ногі ў каленях згінаюцца; рукі адыходзяць ад сцёгнаў; нага прыстаўляецца не найкарацейшым шляхам; паварот выкананы не на 90° або 180°.<br>Адзнака:<br>10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа;<br>9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем; |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | 8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка;<br>7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі;<br>6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі;<br>5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі;<br>4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі;<br>3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі;<br>2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак;<br>1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак |
| 15. | Страявы крок | Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы | Памылкі:<br>корпус адведзены назад; адсутнічае каардынацыя ў руху рук і ног; галава апушчана ўніз; рух рукамі каля цела выконваецца не ад пляча, а за кошт згінання ў локцях; пад’ём ног ад зямлі ніжэйшы за 15 см; памер кроку меншы (большы) за 70–80 см; нага заносіцца за нагу; рух рук |

| №<br>п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку.<br>Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | наперад выконваецца ніжэй (вышэй) за ўсталяваную вышыню, пры руху назад рука не выпраўлена.<br>Адзнака:<br>10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа;<br>9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем;<br>8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка;<br>7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі;<br>6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі;<br>5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі;<br>4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі;<br>3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі;<br>2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак; |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | 1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак |
| 16. | Павароты ў руху | Вучні знаходзяцца на пляцы ў двухшарэнгавым страі. Па камандзе кіраўніка заняткаў вучань выходзіць са строю і выконвае страявыя прыёмы | Памылкі:<br>паварот выкананы несвоечасова; паварот направа, налева выконваецца не на насках абедзвюх ног; рух рукамі пры павароце выконваецца не ў такт кроку; пры руху галава апушчана ўніз; адсутнічае каардынацыя ў руху рук і ног; корпус цела пры павароце пададзены назад.<br>Адзнака:<br>10 балаў – прыём выкананы ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, дакладна, упэўнена, прыгожа;<br>9 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем;<br>8 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 1 памылка;<br>7 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 2 памылкі;<br>6 балаў – прыём выкананы ў адпаведнасці з патрабаваннямі страявога статута, але недастаткова дакладна, з намаганнем, дапушчана 3 памылкі;<br>5 балаў – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дапушчана 2 памылкі; |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | 4 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 3 памылкі;<br>3 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, дрэнная рэакцыя, дапушчана 4 памылкі;<br>2 балы – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана 5 памылак;<br>1 бал – дзеянні недакладныя, млявыя, адсутнічае страявая падцягнутасць, дрэнная рэакцыя, дапушчана больш за 5 памылак |
| Ваенная тапаграфія | | | |
| 17. | Вызначэнне старон гарызонту па компасе | У вучня ёсць компас.<br>З дапамогай компаса вучань вызначае стораны гарызонту. Час (да 2 мін) адлічваецца ад каманды «Да арыентавання прыступіць» да паказу на мясцовасці напрамкаў старон гарызонту па мясцовых прадметах (арыенцірах) | Памылкі:<br>памылка ў вызначэнні старон гарызонту (5–10°); час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 2 мін 30 с); у якасці арыенціра выбраны дрэнна прыметныя на мясцовасці прадметы; няўменне карыстацца компасам, няўпэўненыя дзеянні.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана больш за 3 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 3 мін; памылка ў вызначэнні старон гарызонту перавышае 10°.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні старон гарызонту не перавышае 3° |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| 18. | Вызначэнне старон гарызонту па Сонцы і гадзінніку | У вучня ў руках знаходзіцца гадзіннік або макет цыферблата гадзінніка. На небе відаць Сонца. Вучань вызначае стораны гарызонту па Сонцы з выкарыстаннем гадзінніка. Час (да 2 мін) адлічваецца ад каманды «Да арыентавання прыступіць» да паказу на мясцовасці напрамкаў старон гарызонту па мясцовых прадметах (арыенцірах) | Памылкі:<br>памылка ў вызначэнні старон гарызонту (10–15°); час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 2 мін 30 с); у якасці арыенціра выбраны дрэнна прыметныя на мясцовасці прадметы; няправільна размешчаны гадзіннік у адносінах да Сонца; вучань не ведае, які вугал на цыферблаце дзеляць напалам да поўдня і пасля поўдня.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 3 мін), памылка ў вызначэнні старон гарызонту перавышае 15°.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні старон гарызонту не перавышае 6° |
| 19. | Вызначэнне старон гарызонту па нябесных свяцілах і мясцовых прадметах | Вучань вызначае стораны гарызонту па нябесных свяцілах (Сонцы, Палярнай зорцы), мясцовых прадметах. Час (да 3 мін) адлічваецца ад каманды «Да арыентавання прыступіць» да паказу на мясцовасці напрамкаў старон гарызонту па мясцовых прадметах (арыенцірах) | Памылкі:<br>памылка ў вызначэнні старон гарызонту (15–20°); час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 2 мін 30 с); у якасці арыенціра выбраны дрэнна прыметныя на мясцовасці прадметы; не выкарыстаны ў поўным аб’ёме відавочныя ўласцівасці мясцовых прадметаў.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі; |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | | 1–2 балы – дапушчана 4 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышаны (да 3 мін), памылка ў вызначэнні старон гарызонту перавышае 20°.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні старон гарызонту не перавышае 9° |
| 20. | Вызначэнне магнітнага азімута на ўказаны прадмет па компасе | Кіраўнік заняткаў паказвае прадмет на мясцовасці і ставіць задачу – вызначыць па компасе азімут напрамку на гэты прадмет. Час (да 3 мін) адлічваецца ад указання мясцовага прадмета да даклада вучня «Гатова» | Памылкі:<br>памылка ў вызначэнні магнітнага азімута перавышае 10°; час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 3 мін; няўменне карыстацца візірам компаса; няўменне выканаць адлік па компасе.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі, або час, затрачаны на выкананне нарматыву, перавышае 4 мін, памылка ў вызначэнні магнітнага азімута перавышае 15°.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі памылка ў вызначэнні магнітнага азімута не перавышае 5° |
| Ваенна–медыцынская падрыхтоўка | | | |
| 21. | Раскрыццё пакета перавязачнага індывідуальнага | Вучань знаходзіцца ў зыходным становішчы лежачы на баку, у руцэ трымае пакет. Па камандзе «Да выканання нарматыву прыступіць» раскрывае пакет. Вымае шпільку і прышпільвае яе да свайго адзення, | Памылкі:<br>не вынята і не прышпілена да адзення шпілька; не разгорнуты цалкам падушачкі; няправільнае палажэнне бінта ў руках; парушана стэрыльнасць пакета перавязачнага індывідуальнага.<br>Адзнака: |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| | | не зашпільваючы. Падрыхтоўвае пакет да аказання першай дапамогі | 9–10 балаў – нарматыў выкананы за 20 с, стэрыльнасць не парушана;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 22 с, стэрыльнасць не парушана;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 24 с, стэрыльнасць не парушана;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 26 с, стэрыльнасць не парушана;<br>1–2 балы – нарматыў выкананы за 28 с, парушана стэрыльнасць.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца пры выкананні нарматыву без памылак, кожная дапушчаная памылка зніжае адзнаку на 1 бал |
| 22. | Накладанне асептычнай павязкі на вобласць жывата | Вучань знаходзіцца ў зыходным становішчы лежачы на баку, побач з ім – манекен (або статыст, які выконвае ролю параненага).<br>Час, затрачаны на агаленне раны, не ўлічваецца (дапускаецца бінтаванне на абмундзіраванне). Перавязачны матэрыял знаходзіцца ў руках вучня або побач з ім. Час адлічваецца ад каманды «Да выканання нарматыву прыступіць» (ад пачатку разгортвання перавязачнага матэрыялу) да замацавання павязкі (шпількай або канцамі надарванай стужкі бінта) | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку на 2 балы:<br>павязка накладзена слаба (спаўзае) або пры яе накладанні ўтвараюцца «кішэні», зморшчыны; павязка не замацавана або замацавана вузлом над ранай.<br>Адзнакі па часе :<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 40 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 1 мін 50 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 2 мін;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 2 мін 10 с;<br>1–2 балы – нарматыў выкананы за 2 мін 20 с.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| 23. | Павязка герметычная на грудзі «Аклюзіўная» (накладваецца адным перавязачным пакетам або бінтам з падушачкамі) | Вучань знаходзіцца ў зыходным становішчы лежачы на баку, побач з ім – манекен (або статыст, які выконвае ролю параненага).<br>Час, затрачаны на агаленне раны, не ўлічваецца (дапускаецца бінтаванне на абмундзіраванне). Перавязачны пакет знаходзіцца ў руках вучня. Час адлічваецца ад каманды «Да выканання нарматыву прыступіць» да замацавання павязкі (шпількай або канцамі надарванай стужкі бінта) | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку на 2 балы:<br>павязка накладзена слаба (парушана герметычнасць) або пры яе накладанні ўтвараюцца «кішэні», зморшчыны; павязка не замацавана або замацавана вузлом над ранай.<br>Адзнакі па часе :<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 2 мін 30 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 2 мін 40 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 2 мін 50 с;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 3 мін;<br>1–2 балы – нарматыў выкананы за 3 мін 10 с.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі павязка накладзена роўна, без перакосаў і скручвання |
| 24. | Накладанне жгута на сцягно (плячо) | Вучань знаходзіцца ў зыходным становішчы лежачы на баку, побач з ім – манекен (або статыст, які выконвае ролю параненага). Вучань трымае ў руках жгут.<br>Час адлічваецца ад каманды «Да выканання нарматыву прыступіць» да замацавання жгута і абазначэння часу яго накладання | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку на 2 балы:<br>накладанне жгута на вобласць ранення або ніжэй; накладанне жгута на аголены ўчастак цела без падкладкі, ушчамленне жгутом скуры; вучань не абазначыў час накладання жгута.<br>Адзнака па часе:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 25 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 27 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 30 с;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 32 с;<br>1–2 балы – нарматыў выкананы за 35 с, няправільнае накладанне жгута (расслабленне або саслізгванне), што можа выклікаць паўторны крывацёк.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі адсутнічае празмернае перацягванне жгутом канечнасці |

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| 25. | Накладанне закруткі з дапамогай хусткі і іншых падручных сродкаў на сцягно (плячо) | Вучань знаходзіцца ў зыходным становішчы лежачы на баку, побач з ім – манекен (або статыст, які выконвае ролю параненага).<br>Побач размешчаны падручныя сродкі для спынення крывацёку. Час адлічваецца ад каманды «Да выканання нарматыву прыступіць» да замацавання закруткі і абазначэння часу яе накладання | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку на 2 балы:<br>накладанне закруткі на вобласць ранення або ніжэй; накладанне закруткі на аголены ўчастак цела без падкладкі, ушчамленне скуры закруткай; вучань не пазначыў час накладання закруткі.<br>Адзнака па часе:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы за 40 с;<br>7–8 балаў – нарматыў выкананы за 43 с;<br>5–6 балаў – нарматыў выкананы за 45 с;<br>3–4 балы – нарматыў выкананы за 50 с;<br>1–2 балы – нарматыў выкананы за 55 с, няправільнае накладанне закруткі (расслабленне або саслізгванне), што можа выклікаць паўторны крывацёк.<br>Найвышэйшы бал адзнакі выстаўляецца, калі адсутнічае празмернае перацягванне хусткай канечнасці |

## НАРМАТЫВЫ ПА МЕДЫЦЫНСКАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

| № п/п | Назва нарматыву | Парадак (умовы) выканання нарматыву | Памылкі, якія зніжаюць адзнаку. Адзнака |
|---|---|---|---|
| 1. | Раскрыццё пакета перавязачнага індывідуальнага | Вучань трымае пакет у левай руцэ і па камандзе педагагічнага работніка раскрывае яго. Вымае шпільку і прышпільвае яе да свайго адзення, не зашпільваючы. Чахол пакета кладзе вонкавым бокам на стол | Памылкі:<br>не вынята і не прышпілена да свайго адзення шпілька; не разгорнуты цалкам падушачкі; няправільнае палажэнне бінта ў руках; парушана стэрыльнасць пакета перавязачнага.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак; |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | 7–8 балаў – дапушчана 1 памылка, стэрыльнасць не парушана;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі, стэрыльнасць не парушана;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі |
| 2. | Накладанне павязкі на галаву «чапцом», на перадплечча, локцевы, каленны і прамянёвазапясцевы суставы | Перавязачны матэрыял (бінты нестэрыльныя, загорнутыя ў паперу, лічацца ўмоўна стэрыльнымі) ляжыць на стале побач са статыстам, якому накладаецца павязка. Дапускаецца накладанне павязкі на адзенне. Статыст (манекен) размяшчаецца ў зручным для накладання павязкі становішчы. Па заданні і камандзе педагагічнага работніка вучні накладаюць паказаную павязку. Выкананне нарматыву завяршаецца замацаваннем канца бінта | Памылкі:<br>парушэнне стэрыльнасці перавязачнага матэрыялу; не выканана тэхналогія накладання павязкі; накладанне павязкі не на тую вобласць (бок); няправільнае трыманне бінта ў руках; ненадзейнае замацаванне павязкі.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка, стэрыльнасць не парушана;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі, стэрыльнасць не парушана;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі, парушана стэрыльнасць;<br>1– балы – дапушчана 4 памылкі |
| 3. | Накладанне жгута (закруткі) на сцягно і плячо | Статыст (манекен) ляжыць у зручным становішчы. Вучань трымае разгорнуты жгут у руках, на стале побач ляжаць матэрыял для накладання жгута, або закруткі, блакнот і аловак. Жгут (закрутку) накладаюць на адзенне. Па заданні і камандзе педагагічнага работніка вучань накладае жгут (закрутку) на | Памылкі:<br>накладанне жгута (закруткі) не на тую вобласць (бок); празмернае перацягванне канечнасці або наяўнасць пульсу на перыферычным сасудзе; не запісаны час накладання жгута (закруткі); накладанне жгута (закруткі) на голае цела.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў – дапушчана 2 памылкі; |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | паказаную вобласць, паказвае час яго накладання (гадзіны, хвіліны), падкладвае запіску пад апошні ход жгута (пад закрутку) і кантралюе адсутнасць пульсу на перыферычным сасудзе | 3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі |
| 4. | Імабілізацыя пляча, перадплечча, сцягна, галёнкі падручнымі сродкамі пры пераломах | Статыст (манекен) пры імабілізацыі верхняй канечнасці сядзіць, пры імабілізацыі ніжняй канечнасці – ляжыць. Падручныя сродкі імабілізацыі (палоскі фанеры, рэйкі, іншыя падручныя сродкі даўжынёй 30–50 см, 70–150 см), а таксама бінты, хустка і вата ляжаць на стале. Вучні падбіраюць і падганяюць сродкі імабілізацыі ў адпаведнасці з заданнем. Імабілізацыя пры пераломах праводзіцца без накладання павязкі і на адзенне | Памылкі:<br>дрэнна падабраныя і падагнаныя падручныя сродкі імабілізацыі; канечнасці нададзена няправільнае становішча; назіраецца рухомасць у двух бліжэйшых да месца пералому суставах (пры пераломах сцягна нерухомымі павінны быць тазабедраны, каленны і галёнкаступнёвы суставы); пры імабілізацыі пляча і перадплечча рука не падвешана на хустцы.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў –дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі |
| 5. | Тэхніка накладання гарчычнікаў, кампрэсаў, грэлкі, пузыра з лёдам | Статыст (манекен) сядзіць на крэсле (ляжыць на кушэтцы).<br>На стале побач грэлка гумавая 1,5–2 л (пузыр з лёдам), кампрэсійная папера, латок, вазелін (дзіцячы крэм), ручнік, вата, бінт, флакон з вадой, якая імітуе спірт, тэрмометр для вымервання тэмпературы вады, сурвэткі для дэзінфекцыі. | Памылкі:<br>не агледжана скура статыста перад працэдурай; не праверана (не адпавядае) тэмпература вады; не праверана герметычнасць грэлкі (пузыра з лёдам), грэлкіа (пузыр з лёдам) не ўкручана ў ручнік; гарчычнік прыкладзены да скуры не тым бокам; кампрэсійная папера не выходзіць за папярэдні слой; ненадзейна замацаваны кампрэс; не дакладны час экспазіцыі; няправільна (не дакладна) выбрана зона ўздзеяння. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Вучань пачынае выкананне працэдуры накладання кампрэсу, грэлкі, пузыра з лёда, гарчычнікаў (на статысце) | Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў –дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі |
| 6. | Догляд хворых і паражоных | Статыст (манекен) сядзіць у крэсле. На стале побач тэрмометр, секундамер (гадзіннік з секунднай стрэлкай), прыбор для вымервання артэрыяльнага ціску, флакон з вадой, якая імітуе спірт, або адэкалон, вата. Вучань вымервае статысту тэмпературу цела, частату пульсу і дыхання, артэрыяльны ціск | Памылкі: перад устаноўкай статысту паказчыкі тэрмометра не правяраліся і не збіваліся да мінімальных; тэрмометр не працёрты спіртам або адэкалонам; тэрмометр няправільна ўстаноўлены ў падпахавую ямку; не знойдзены пульс у прамянёвазапясцевым суставе; няправільна установлена манжэта для вымервання артэрыяльнага ціску; не вызначаны верхні (сісталічны) і ніжні (дыясталічны) ціск.<br>Адзнака:<br>9–10 балаў – нарматыў выкананы без памылак;<br>7–8 балаў – дапушчана 1 памылка;<br>5–6 балаў –дапушчана 2 памылкі;<br>3–4 балы – дапушчана 3 памылкі;<br>1–2 балы – дапушчана 4 памылкі |